6. *Публикация заметок и статей* об общественной жизни факультета и о важности профессии журналиста в современном мире.

7. *Проведение конкурса на лучшее эссе: «Почему я хочу стать журналистом»* для старшеклассников.

8. *Конференция для старшеклассников «Юный журналист»* (март–апрель) с обязательным изданием сборника материалов и публичным вручением его авторам.

9. *Проведение общественных мероприятий на факультете с приглашением старшеклассников*.

10. *Подготовительные курсы по дисциплине «Творчество»*, которые помогут в подготовке к вступительным испытаниям (творческое сочинение, творческое тестирование и др.).

Изложенные ориентиры раскрывают динамику коммуникационного процесса, понимание коммуникаторами интересов и запросов аудитории, поиск творческих подходов к достижению обозначенной цели, что необходимо для будущей профессиональной деятельности магистрантов и студентов в современной медиасфере.

## МЕДЫЯСАЦЫЯЛІЗАЦЫЯ ЯК СКЛАДНІК МЕДЫЯАДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

***С. В. Венідзіктаў***

*Установа адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», вул. Крупскай, 67, 212011, г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь, venidiktov@institutemvd.by*

Разглядаюцца асаблівасці медыясацыялізацыі асобы як стыхійнай з’явы, што праходзіць у новых сацыяльна-культурных умовах, яе адрозненні ад мэтанакіраванай дзейнасці ў межах медыяадукацыйнага працэсу. Вызначаюцца стратэгічныя задачы развіцця медыйнай граматнасці ва ўмовах стыхійнай медыясацыялізацыі.

***Ключавыя словы:*** медыяадукацыя; медыясацыялізацыя; медыйная граматнасць; інфармацыйная прастора; інтэрнэт; адукацыя.

# MEDIA SOCIALIZATION AS A COMPONENT OF THE MEDIA EDUCATIONAL PROCESS

***S. V. Venidiktov***

*Educational institution «Mogilev Institute of the Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus»,*
*67, Krupskaya Str., 212011, Mogilev, Republic of Belarus*
*Corresponding author: S. V. Venidiktov (venidiktov@institutemvd.by)*

The features of media socialization of the individual as a spontaneous process taking place in new socio-cultural conditions, its differences from purposeful activity within the framework of media educational practices are considered. The strategic objectives of media literacy development in the context of spontaneous media socialization have been established.

***Key words:*** media education; media socialization; media literacy; information space; Internet; education.

Ва ўмовах імклівай медыятызацыі ўсіх сфер жыцця грамадства медыяадукацыя з працэсу кіруемага і стратэгічна важнага для развіцця інфармацыйнай кампетэнтнасці індывіда ператвараецца ў працэс стыхійны. У той жа час – у значнай ступені непазбежны, бо медыйная граматнасць, фарміраванне якой з’яўляецца адной з першасных мэт медыяадукацыі, прэтэндуе на дамінаванне ў сістэме агульных кампетэнцый сучаснага чалавека. Калі яшчэ ў пачатку XXI стагоддзя дэкларавалася патрэба ў распаўсюджванні практык медыяадукацыі ў навучальным працэсе ўсіх узроўняў, то цяпер мэтазгодна весці гаворку пра зусім іншую тэндэнцыю: неабходнасць упарадкаваць натуральны працэс фарміравання медыяграматнасці. Першапачаткова дэкларуемая мэта медыяадукацыі – набыццё навыкаў камунікацыі ў сучаснай інфармацыйнай прасторы – таксама зведала змены: варта весці гаворку, хутчэй, пра навыкі эфектыўнай камунікацыі ў сеткавай прасторы ў кантэксце неабходнасці забеспячэння інфармацыйнай бяспекі асобы.

Мяркуем, што падобныя змены ў значнай ступені абумоўлены актывізацыяй працэсу медыясацыялізацыі асобы, які таксама мае стыхійны характар. Пад медыясацыялізацыяй мы разумеем працэс засваення індывідам правілаў, каштоўнасцей, практык, распаўсюджаных у канкрэтным інфармацыйна-камунікатыўным асяроддзі, з наступнай рэалізацыяй набытых кампетэнцый праз розныя віды індывідуальнай і групавой актыўнасці ў медыяпрасторы. А. Лучынкін прапануе наступнае азначэнне медыясацыялізацыі: «набыццё асобай са-

цыяльнага вопыту пераважна на аснове штучных медыяпрэзентацый, ва ўмовах адсутнасці ўдзелу ў гэтым працэсе наваколля, праз якое сацыялізуецца асоба» (пераклад наш. – *С. В.*) [1, с. 7]. Розным аспектам працэсу медыясацыялізацыі ў кантэксце медыяадукацыйных практык прысвечаны працы С. Венідзіктава [2; 3], С. Сімаковай [4], А. Пішчовай [5], А. Давыдоўскага [6], таксама праблема закранаецца ў даследаваннях В. Абраменкавай, М. Бутырынай, В. Мудрык, Ф. Гудсі, М. Данілавай, Б. Ліхтэнштэйна, С. Цымбаленкі і інш. аўтараў. Як адзначае А. Вартанава, «медыясацыялізацыя для моладзевай аўдыторыі – гэта адзін з ключавых спосабаў засваення і ўзнаўлення норм і каштоўнасцей сацыяльнага свету як на ўзроўні першаснай, так і на ўзроўні другаснай сацыялізацыі» (пераклад наш. – *С. В.*) [7]. А. Пішчова звяртае ўвагу на сацыяльна-педагагічныя рызыкі медыясацыялізацыі: спажыванне маніпулятыўнага кантэнту, віртуалізацыя зносін, распаўсюджванне форм віртуальнай агрэсіі, парушэнне вучэбнай дзейнасці, фарміраванне сеткавай залежнасці і інш. [5, с. 26] Да канца не вырашанай задачай уяўляецца фармуліроўка стратэгічных задач развіцця медыяадукацыі ва ўмовах стыхійнай медыясацыялізацыі асобы, што і вызначае мэту нашага даследавання.

Медыясацыялізацыя як працэс мае натуральны характар, бо спалучаецца з задавальненнем першасных патрэб індывіда ў інфармацыйна-камунікатыўнай прасторы: спажыванне кантэнту сродкаў масавай камунікацыі, выкарыстанне рэсурсаў сацыяльных медыя, стварэнне ўласнага медыйнага кантэнту, канструіраванне свайго вобраза ў інтэрнэт-асяроддзі, ажыццяўленне міжасобасных і іншых форм камунікацыі праз сеткавыя рэсурсы, пошук інфармацыі ў адкрытых крыніцах і яе выкарыстанне для вырашэння паўсядзённых задач (у т. л. адукацыйных), фарміраванне індывідуальнай карціны свету на падставе спажываемага медыякантэнту і асабістага вопыту актыўнасці ў афлайн-прасторы і г. д. Таму медыясацыялізацыю можна таксама лічыць элементам у агульнай структуры сацыялізацыі (або самасацыялізацыі) асобы, актуалізаваным ва ўмовах інфарматызацыі грамадства і лакалізаваным пераважна ў інтэрнэце, які ўсё часцей разглядаюць у якасці асобнага, унікальнага інфармацыйна-сацыяльнага асяроддзя і асобнай культурнай прасторы. Напрыклад, вынікі праведзенага ў Беларусі даследавання паказваюць, што «фокус аўтарытэтных крыніц інфармацыі для сучаснай моладзі зрушыўся з бліжэйшага асяроддзя ў Сеціва. На пытанне “Калі вам тэрмінова трэба атрымаць адказ на пытанне, дзе вы яго шукаеце ў першую чаргу?” <...> 89,2 % апытаных з 2 344 чалавек далі адказ

“у інтэрнэце, гуглю” і не больш за 2 % звернуцца з пытаннем да бацькоў» (пераклад наш. – *С. В.*) [8, с. 233–234].

Стыхійнасць медыясацыялізацыі, у адрозненне ад мэтанакіраванай дзейнасці ў межах медыяадукацыйных практык, выяўляецца праз наступныя яе асаблівасці:

1) адсутнасць усвядомленай мэты (фарміраванне медыйнай граматнасці, агульнай інфармацыйна-камунікатыўнай культуры асобы);

2) супярэчлівасць усведамляемых асобай задач дадзенага працэсу (усведамленне на ўзроўні сітуатыўных патрэб, калі сацыялізацыя ў медыйнай прасторы выступае пабочным прадуктам дзейнасці);

3) неаднароднасць набываемых індывідам кампетэнцый (знаходзіцца ў залежнасці ад суб’ектыўна прывабных відаў інфармацыйнай актыўнасці, агульнай адукаванасці);

4) залежнасць ад спецыфікі лакальнага сацыяльнага асяроддзя, у якім адбываецца медыясацыялізацыя, яго інфармацыйных пераваг і сістэмы каштоўнасцей (напрыклад, забава праз прагляд мультымедыйных матэрыялаў сацыяльных сетак або стварэнне ўласнага кантэнту аналітычнага характару ў выглядзе блогаў);

5) узаемаабумоўленасць з задачамі і прыярытэтамі асноўнай дзейнасці, якая рэалізуецца ў афлайн-прасторы (напрыклад, вывучэнне масавай камунікацыі ў спецыялізаванай навучальнай установе);

6) адсутнасць дакладных часавых межаў і храналагічнай абумоўленасці працэсу (немагчымасць дакладнага вылучэння этапаў, іх характарыстык, фіксацыі завяршэння працэсу);

7) неадназначнасць вызначэння характарыстык медыясацыялізаванай асобы як выніку працэсу медыясацыялізацыі.

Можна сцвярджаць, што заканамерным вынікам працэсу стыхійнай медыясацыялізацыі становіцца рост узроўню падрыхтаванасці школьнікаў і студэнтаў («лічбавых абарыгенаў», «лічбавай моладзі») да вывучэння дысцыплін, для засваення якіх першапачаткова патрабуецца медыйная граматнасць (напрыклад, спецыяльныя дысцыпліны курсаў вэб-журналістыкі і аўдыявізуальнай журналістыкі). Наш вопыт распрацоўкі метадычнага забеспячэння выкладання дысцыпліны «Інтэрнэт-камунікацыя ў дзейнасці органаў унутраных спраў» у Магілёўскім інстытуце МУС паказаў штогадовае зніжэнне актуальнасці для навучэнцаў тэматыкі, звязанай з агульнымі паняццямі і тэндэнцыямі развіцця сусветнай інфармацыйнай прасторы, з характарыстыкамі сеткавых супольнасцей, правіламі і інструментамі забеспячэння асабістай бяспекі ў інтэрнэце і г. д. Пры гэтым засвоеныя самастойна

прынцыпы і практыкі інфармацыйных паводзін з’яўляюцца для навучэнцаў хутчэй пабочным прадуктам іх дзейнасці.

У такой сітуацыі ўяўляецца найбольш перспектыўнай інтэграцыя практык стыхійнай медыясацыялізацыі ў медыяадукацыйныя праграмы, што дазволіць эфектыўна выкарыстоўваць натуральны працэс развіцця медыйнай граматнасці і ўпарадкаваць фарміраванне неабходных кампетэнцый. На базавым узроўні гэта дасягаецца праз вывучэнне дамінуючых спосабаў інфармацыйна-камунікатыўнай актыўнасці асобы на канкрэтным этапе яе індывідуальнага развіцця (напрыклад, стварэнне ўласнага мультымедыйнага кантэнту) і наступнае ўкараненне гэтых практык у адукацыйныя планы. Больш складаная задача – стварэнне адзінай сістэмы агульных і спецыялізаваных кампетэнцый, якія набываюцца ў працэсе медыясацыялізацыі і з’яўляюцца рэлевантнымі ў кантэксце задач, што вырашаюцца медыяадукацыяй, – патрабуе правядзення спецыяльных даследаванняў у гэтай галіне. Такім чынам, супярэчнасці ў мэтах і задачах медыяадукацыі і медыясацыялізацыі асобы з’яўляюцца ўяўнымі. Медыясацыялізацыя стварае аснову для фарміравання медыйнай граматнасці на масавым узроўні, што з’яўляецца адным з прыярытэтаў медыяадукацыі. Стыхійны характар гэтага працэсу не супярэчыць агульнаму кіруемаму характару медыяадукацыі, а толькі дапаўняе яго, фарміруючы новае медыйнае асяроддзе, новы тып суб’екта адукацыйнай прасторы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Лучинкина А. И*. Модель интернет-социализации личности // Информационно-психологическая безопасность личности в интернет-пространстве: учеб. пособие. Симферополь: ДИАЙПИ, 2015. С. 6–13.
2. *Венидиктов С. В*. Новая информационная идеология: от медиаобразования – к гражданской коммуникации // Медиаисследования – 2015: сб. науч. работ. Барнаул: ИП Колмогоров, 2015. С. 26–34.
3. *Венидиктов С. В*. Развитие гражданского медиаобразования в Евразийском экономическом союзе // ЗНАК. Проблемное поле медиаобразования: научный журнал. 2017. № 1 (23). С. 40–48.
4. *Симакова С. И.* Визуальный контент средств массовой коммуникации как средство медиасоциализации молодежи // III Моисеевские чтения: Культура и гуманитарные проблемы современной цивилизации: докл. и матер. Общеросс. (нац.) научн. конф. М., 11–12 марта 2020 г. М.: Моск. гуманит. ун-т, 2020. С. 440–427.
5. *Пищова А. В., Давыдовский А. Г.* Риски медиасоциализации в обеспечении медиабезопасности обучающихся // Образование как фактор развития ин-

теллектуально-нравственного потенциала личности и современного общества: матер. VII Междунар. науч. конф., СПб, 9–10 ноября 2017 г. СПб.: ЛГУ им. А. С. Пушкина, 2017. С. 26–31.
6. *Давыдовский А. Г.* Проблема педагогических рисков виртуализации высшего образования // Вестник БГУ. Сер. 4, Филология. Журналистика. Педагогика. 2015. № 1. С. 75–78.
7. *Вартанова Е. Л*. К вопросу о теоретическом осмыслении процесса медиасоциализации молодежи // Медиа в современном мире: 59 Петербургские чтения: сб. матер. Междунар. науч. форума, СПб, 9–12 ноября 2020 г. [Электронный ресурс]. URL: https://smif.spbu.ru/images/2020-thesis/Vartanova/BB_Вартанова_Вартанова.docx (дата обращения: 17.08.2021).
8. *Касперович-Рынкевич О. Н.* Медиасоциализация молодежи в условиях медиатизации общества // Журналистика – Медиалогия – Наставничество: матер. Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 1 марта 2021 г. Минск: БГУ, 2021. С. 232–235.

# УНИВЕРСАЛЬНЫЕ КОМПЕТЕНЦИИ VS ФУНКЦИОНАЛЬНАЯ ГРАМОТНОСТЬ

***И. Д. Воюш***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*vojush@rambler.ru*

В тезисах очерчены некоторые базовые различия между понятиями «универсальные компетенции» и «функциональная грамотность» – в применении к научно-методическим разработкам, обеспечивающим образовательный процесс по специальности «Журналистика (по направлениям)».

***Ключевые слова:*** высшее образование; универсальные компетенции; функциональная грамотность.

# UNIVERSAL COMPETENCIES VS FUNCTIONAL LITERACY

***I. D. Voyush***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: I. D. Voyush (vojush@rambler.ru)*

The theses outline some basic differences between the concepts of «universal competencies» and «functional literacy» in application to scientific and